5 снежня "Літратурная гасцёўня" Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музея в. Гудзевічы Мастоўскага раёна запрасіла гродзенскіх паэтаў Людмілу Кебіч, Вікторыю Смолку, Ганну Скаржынскую-Савіцкую і Мікалая Іваноўскага на традыцыйную сустрэчу. Зіма, каляды, Новы год, а найперш, малая радзіма – вось тыя тэмы, якія акрэслілі паэты, чытаючы свае новыя вершы. Цёплая, звыклая атмасфера зацікаўленасці і ўвагі панавалі ў залі. Наведванне гэтага куточка беларускасці натхняе на новыя творы. Гудзевічы захапляюць, вабяць, прыцягваюць, гэта сапраўднае месца сілы для творцаў. Дзякуем арганізатарам сустрэчы за сардэчны прыём!



***Фота на памяць пасля сустрэчы***



***Кнігі ў падарунак***